# АЛЬТЭРНАТЫВА АФІЦЫЙНАЙ ІДЭАЛОГІІ
# “ЗА БЕЛАРУСЬ”

**Некаторыя тэхнікі і стратэгіі дэканструкцыі ідэалагічнага дыскурсу ўлады з боку апазіцыйных формаў дыскурсіўнасці***

***пераважная частка медыя-матар’ялаў змешчаная на сайце http://www.belzhaba.com**

Прэзэнтацыя тычыцца разгляду некаторых тэхнік сымбалічнай дэканструкцыі дыскурсу афіцыйнай ідэалогіі, змешчанага у серыі медыя-вобразаў (плакатаў “За Беларусь”), і спрабуе акрэсліць асноўныя пункты супрацьстаяння афіцыйнага і апазіцыйнага палітычных дыскурсаў, што да адлюстравання вобразу найноўшай Беларусі

# Постэры І пакалення

На сымбалічны дыскурс афіцыйнай ідэалогіі ідзе напластаванне дыскурсу апазіцыйнай палітыкі – параўнанне афіцыйнага каналу мас-медыя са сметнікам, а дзяцей, што назіраюць за дзенасцю машыны па збору смецця з беларускім грамадствам як грамадствам спектаклю



Дэканструкцыя сымбалічнага паслання ўладнага дыскурсу дасягаецца за кошт выкарыстання логікі парадоксу – несупадзення выявы і тэксту



Спроба падрывання афіцыйнай ідэалогіі за кошт супрацьпастаўлення яе лёзунгаў цытатам ўрадавых чыноўнікаў, якія водле апазіцыйнага дыскурсу маюць наступствам выкрыццё “пустэчы рэальнага”, што месціцца за парадным фасадам грамадскага жыцця



Падрыванне ідэалагічнага дыскурсу ўлады за кошт іроніі над створанымі пры яе ўдзеле маладзвымі структурамі, дзейнасць якіх водле апазіцыйнага дыскурсу кранае адно сферы прыватнага здавальненя маладзёнаў і не тычыць іхных сапраўдных духоўных патрэбаў



Саркастычнае парадырванне афіцыйных постэраў з выявамі самабытнай Беларусі, увасобленай ў вобразы-сымулякры апранутых у этнічнае адзенне беларусак сталага веку, народных майстроў як “афіцыйнага твару” этнічнай Беларусі, што ствараюць вобраз “гламурнай Беларусі”



# ПОСТЭРЫ II ПАКАЛЕННЯ



Дэканструкцыя вобразаў  афіцыйнай ідэалогіі, што намагаецца стварыць выяву будучыні Беларусі праз прэзэнтацыю патэнцыялу моладзі- чальцоў БРСМ (плякаты “Наперад, у будучыню”, “БРСМ”), дасягаецца за кошт іранічнага каляжу – памены асобаў юнакоў на іхныя сымбалічыя антыподы



# ПОСТЭРЫ ІІІ ПАКАЛЕННЯ

Сымболіка афіцыйнай ідэалогіі выкарыстоўваецца і перакручваецца як адлюстраванне кантраверсыйнай прыроды прапаганды, што з аднаго боку заклікае да ўз’яднання з Расіяй і яе народам, а з іншага вядзе несупынныя «газавыя», «нафтавыя», малочныя» і іншыя войны з расейскім урадам



Напластаванне на ўладны дыскурс апазіцыйнага палітычнага дыскурсу, што ў сымбалічнай форме прэзэнтуе “рэальны” клопат дзяржавы над забеспячэннем  сацыяльнай абароны інвалідаў і людзей з абмежаванымі магчымасцямі



Саркастычны перафраз “касмічнай праграмы” Беларусі як вузлавога пункту выштукарвання афіцыйнай ідэалогіі брэнду “Беларусь”






Сымбалічнае перапрачытанне афіцыйнага дыскурсу “інавацыйнага развіцця РБ” і выкарыстання “высокіх тэхналёгіяў” на карысць дзяржаве з пункту гледжання ўспрыймання пераважнай агратэхнічнай скіраванасці беларускіх навуковых распрацовак

# ПОСТЭРЫ БУДУЧЫНІ…

Сымбалічная рэакцыя на афіцыйную кампанію «За будучыню» Беларусі і касмічныя амбіцыі ўладнага дыскурсу, паяднаная з іроніяй над спробамі афіцыйнай ідэалогіі сцвердзіць асаблівае становішча Беларусі у сусветным геапалітычным раскладзе

